# ИСТОРИЯ

**Вуглік І. Р.**

## СУАДНОСІНЫ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНАГА І ЭТНІЧНАГА Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

В статье рассматривается проблема соотношения цивилизационных и этнических параметров в истории белорусской культуры. В основу исследования положен цивилизационный подход, в котором культура Беларуси изучается в контексте цивилизационных образований восточного и западного типов. В центре изучения – проблема соотношения периодов интенсификации этнических параметров со временем вхождения белорусских земель в восточную либо западную цивилизацию. Делается вывод о соответствии этапов вхождения в новый цивилизационный тип с периодами активизации этничности. Также рассматривается проблема бинарного противостояния цивилизационных конгломератов внутри белорусской культуры. Делается вывод о деформационном воздействии данной дихотомии на устойчивость белорусской этнической аутентики. Рассматриваются позитив-ные и негативные аспекты влияния цивилизационного фактора на этнические индикаторы традиционной культуры.

У вывучэнні гісторыі культуры Беларусі дастаткова плённым з’яўляецца цывілізацыйны падыход, які адпавядае аб’ектыўным рэаліям гістарычнага існавання Беларусі ў спецыфічнай геапалітычнай, метакультурнай прасторы. Гэты падыход дазваляе сістэматызаваць разнастайны матэрыял па палітычнай, эканамічнай, інтэлектуальнай (навука, адукацыя), мастацкай, бытавой культуры, падвесці яго пад інтэграл вялікіх цывілізацыйных тыпаў. Гэта тычыцца і этнічных параметраў беларускай культуры, якія таксама адпаведным чынам суадносяцца з цывілізацыйнымі канцэптамі і інстытутамі. Цывілізацыйны падыход да вывучэння культуры Беларусі выкарыстоўваўся ў даследаваннях аўтара [1; 2: 3], а таксама іншых навукоўцаў [4; 5, 6]. Мэта артыкула – сістэматызацыя кантэнту суадносін цывілізацыйнага і этнічнага ў гісторыі беларускай культуры.

За час свайго існавання культура Беларусі знаходзілася ў двух супрацьлеглых, бінарных цывілізацыйных утварэннях – заходнім і ўсходнім; разам з тым той ці іншы тып на нашых землях ніколі не быў цалкам дамінуючым, але меў рысы іншага цывілізацыйнага тыпу [1; 6]. Храналагічна перыяды можна вызначыць наступным чынам: першы, усходні перыяд протабеларускай культуры і пачатку этнагенезу – IX–XIV стст., час перавагі заходняй цывілізацыі – XV–XVIII стст., час усходняй цывілізацыі – пачатак XIX – пачатак XXI ст. Гэта змена цывілізацыйных парадыгм утварае, як падаецца, галоўную спецыфіку гісторыі культуры Беларусі, а таксама ўласна беларускага этнасу. Як і іншыя этнасы, беларускі зазнаў час этнагенезу (прыблізна XIV–XV стст.), этнічнай гісторыі, якая ўключала часы этнакультурнага ўздыму і стагнацыі, утварэння і знікнення пэўных гістарычных тыпаў беларускага этнасу. Гэтыя перыяды маюць адпаведныя дэтэрмінантныя сувязі з цывілізацыйнымі працэсамі і цывілізацыйнымі ўтварэннямі, куды ўваходзіла Беларусь.

Галоўная канцэпцыя суадносін цывілізацыйнага і этнічнага ў гісторыі беларускай культуры – гэта каталізацыя этнічнасці пры перыядзе пераходу да іншай цывілізацыйнай супольнасці. З пачатку развіцця цывілізацыйных інтэнцый на нашых землях (прыблізна IX ст.) Беларусь увайшла ва ўсходні – візантыйскі, праваслаўны тып цывілізацыі. Перыяд з часоў рассялення славян, у тым ліку крывічоў, у VI ст., звязаны з фарміраваннем тыпу этнічнасці, які трактуецца даследчыкамі як крывіцкі і можа разглядацца як час праэтнічнага станаўлення беларусаў. Разам з тым уласна крывіцкая (а таксама племянныя культуры радзімічаў, дрыгавічоў, валынян, драўлян) суадносяцца з працэсам станаўлення беларускай мовы, а таксама элементаў традыцыйнай культуры. Менавіта ў цывілізацыйных артэфактах нашых земляў адбіліся элементы этнакультурнай спецыфікі. Гэта – пісьмова зафіксаваныя рысы моўнай адметнасці, базілікальная планіроўка першых праваслаўных храмаў, іх арыгінальная пабудова і дэкор, адносна вольная кампазіцыя фрэсак Спаскага храма ў Полацку, насычанае язычніцкімі сімваламі красамоўства Кірылы Тураўскага, асветніцкая дзейнасць Еўфрасінні Полацкай, прыхільнасць да антычных аўтараў Клімента Смаляціча. Гэтыя культурныя з'явы маюць цывілізацыйную глебу, менавіта яны – цівілізацыйныя інверсіі часу адаптацыі культуры беларускіх зямель да візантыйскага свету.

Перыяд этнагенезу беларусаў звязаны з уваходжаннем культуры Беларусі ў заходні (еўрапейскі) тып цывілізацыі – станаўленнем на нашых землях палітычных, эканамічных, культурна-стылёвых (стылі раманскі, гатычны, рэнесанс), мастацкіх, тэалагічных канстант. У XV ст. аформіліся стандарты старабеларускай афіцыйна-справавой, літаратурнай мовы, усталяваліся назвы буйных гісторыка-культурных рэгіёнаў – Белая Русь (замацавалася толькі за нашымі паўночна-ўсходнімі землямі ў XVII ст.), Палессе, Чорная Русь, Літва (назва цэнтральнага і заходняга рэгіёнаў, а таксама ўсёй краіны), этнонімы *літва, літоўскія людзі*, зрэдку (у кірылічным напісанні) – *ліцвіны, русіны* (так зваліся праваслаўныя беларусы і ўкраінцы). Склаліся адметныя прынцыпы дзяржаўнага (на аснове Статутаў), эканамічнага (розныя формы землеўладання, валочная рэформа) уладкавання, сістэмы гарадскога самакіравання. Узніклі спецыфічныя апрацоўкі архітэктуры позняга раманскага стылю, готыкі; істотнае этнакультурнае значэнне мела мадыфікацыя на заходняй, а таксама мясцовай глебе візантыйскай іконы (беларуская іканапісная школа) [7, с. 6]. Як вынік актыўных этнакультурных навацый у 1596 г. у Брэсце ўзнікла этнічна маркіраваная ўніяцкая царква – істотны ўнёсак Беларусі ў хрысціянскую цывілізацыю.

У XVI ст. пад уздзеяннем канфесійных цывілізацыйных параметраў аформілася такая істотная рыса этнічнай псіхалогіі беларусаў, як талерантнасць. Гэта звязана з узнікненнем і пашырэннем у Еўропе пратэстантызму, што зрабілася значным фактарам еўрапейскай палітычнай, эканамічнай, увогуле культурнай гісторыі. Пратэстантызм паклаў канец хрысціянскаму каталіцкаму монаканфесіянізму Еўропы і выклікаў феномен рэлігійных хрысціянскіх еўрапейскіх войнаў (дагэтуль еўрапейцы вялі войны з канфесійным маркерам

з мусульманамі ці рэдка – супраць улады рымскіх пап). У Беларусі праваслаў'е і каталіцызм мірна (маючы на ўвазе ўзброенные дзеянні) суіснавалі дзякуючы лаяльнай палітыцы вялікіх князёў дзяржавы. Распаўсюджванне сярод эліты грамадства, гараджан пратэстантызму выклікала бурныя дыскусіі, дыспуты, але не станавілася прычынай войнаў, як у Нямеччыне, Чэхіі, Францыі. Менавіта рэлігійная лаяльнасць пратэстанцкіх вернікаў на беларускіх землях, а таксама канфесійная верацярпімасць, заклалі падмурак такой адметнай этнапсіхалагічнай рысы беларусаў, як талерантнасць. У сялянскім асяроддзі талерантнасці спрыяла ўніяцтва, якое спавядала абсалютная большасць вяскоўцаў. Узброеныя ж канфлікты на рэлігійнай аснове ў Беларусі не мелі мясцовых каранёў, а былі інспіраваны звонку – агрэсіўнай палітыкай Маскоўскай дзяржавы, запарожскага казацтва, а таксама польскай экспансіяй каталіцызму пад лозунгам: "Адна краіна – адна вера".

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Беларусь змяніла цывілізацыйны вектар на ўсходні, расійскі. У другой палове XVIII ст. культура Беларусі назапашвала шмат высакаякасных еўрапейскіх дасягненняў у галіне эканомікі (мануфактуры, што выраблялі тавар на экспарт), навуцы (праца навукоўцаў, выкладчыкаў езуіцкай акадэміі, шматлікіх калегіумаў), адукацыі (дзейнасць Адукацыйнай камісіі), мастацтве (прафесійны тэатр, класічная музыка, партрэтны жывапіс); асобна можна адзначыць узнікненне этнічна афарбаванай архітэктуры віленскага (беларускага) барока [8, с. 141–157], але гэтыя з'явы не зрабіліся падмуркам новага этнічнага ўздыму па прычыне ўнутраных і знешніх палітычных абставін.

Пераходны перыяд не выклікаў істотных этнічных імпульсаў, наадварот, фармальна пачаўся перыяд этнічнай стагнацыі, які завяршыўся афіцыйнай забаронай гістарычных назваў краіны (*Літва, Беларусь*) і беларускай мовы, распаўсюджваннем дзяржаўнай ідэалогіі заходнерусізму. Эліта этнасу была дэмаралізавана пасля трох няўдалых паўстанняў, адступлення Напалеона, шматлікія яе прадстаўнікі былі арыштаваны, высланыя на далёкі расійскі ўсход ці знаходзіліся ў эміграцыі, гарады засяляліся іншай этнічнай прыналежнасці насельніцтвам. Беларускі (ліцвінскі) этнас існаваў у латэнтным стане, яго маркеры захоўваліся ў культуры шляхецкіх маёнткаў, а таксама сялянствам, прадстаўнікамі дробнай шляхты, гараджан. Тым не менш з пачатку XIX ст. пачалося фарміраванне такіх істотных этнічных кампанентаў будучай культуры, як новая беларуская мова, літаратура.

Новыя цывілізацыйныя змены ў Расіі канца XIX – пачатку XX ст., звязаныя з развіццём буржуазна-дэмакратычных, па сутнасці заходніх, свабод, далі імпульс перыяду інтэнсіфікацыі беларускай этнічнасці, стварэнню новай беларускай культуры, лагічным вынікам чаго было ўтварэнне БНР. Моцны ўплыў на гэтыя працэсы зрабіла звязаная з распадам імперый еўрапейская этнапалітычная парадыгма нацыянальнай дзяржаўнасці, дзякуючы чаму свае дзяржавы атрымалі шмат былых імперскіх народаў, у тым ліку і беларусы. Адметнымі рысамі новай беларускай этнічнасці былі ўсталяванне назвы *Беларусь*, этноніма *беларусы*, палітычнае афармленне нацыянальнай тэрыторыі, улады, кадыфікацыя мовы (на аснове граматыкі Б. Тарашкевіча), стварэнне

на ёй літаратуры, спроба маніфестацыі этнічнай (нацыянальнай) ідэалогіі (Ф. Багушэвіч, В. Ластоўскі, А. Уласаў і інш.). Адметнай рысай этнічнай ідэалогіі, пры яе ў цэлым заходнім цывілізацыйным змесце, адзначалася вялікая доля сацыялістычнага, сацыяльнага кампанента.

Утварэнне БССР (БСР) і звязаныя з гэтай падзеяй этнічная працэсы актывізацыі этнічнасці таксама былі цывілізацыйна абумоўлены пераходам да артадаксальна ўсходняга тыпу культуры – савецкага. Была канчаткова вызначана нацыянальна-адміністрацыйная (не зусім адпавядаючая этнічнай) мяжа (у 1939 г.), сістэма дзяржаўнай улады, савецкая беларуская ідэалогія (канцэпцыя беларускай савецкай нацыі), створаны вялікі пласт культуры з беларускімі маркерамі – дзяржаўная мова (упершыню пасля 1696 г.), беларускамоўныя тэатр, кінематограф, новая літаратура, а таксама навука, адукацыя, сродкі масавай інфармацыі; гэты час атрымаў назву беларусізацыі. Завяршаўся працэс этнічнай кансалідацыі на аснове этноніма *беларусы*, які, у першую чаргу ў сялянскім асяроддзі, замяняў назвы *ліцвіны, тутэйшыя,* субэтнонім *палешукі*, мікраэтнонімы *пінчукі, паляне* і г.д. Упершыню ў этнакультурнай гісторыі беларусаў адзін тып цывілізацыі атрымаў татальнае дамінаванне (выключэннем з’яўляліся каталіцкая, пратэстанцкая канфесіі, творы асобных літаратараў, мастакоў, беларускамоўная рок-музыка). Найбольш відавочна заходняе ўздзеянне праявілася ў грамадскай архітэктуры: гэта мясцовая мадыфікацыя канструктывізму ў 30-е гг., будынкі 70–80-х гг. XX стагодзя.

Наступны ўздым этнічнасці 90-х г. XX ст. таксама звязаны з інтэнсіфікацыяй цывілізацыйнай парадыгмы – на гэты раз заходняй, ідэалогіяй самастойнай нацыянальнай дзяржаўнасці, правоў чалавека. Яго адметнымі рысамі было зніжэнне ролі сацыялістычнага, сацыяльнага фактару пры рэфлексіі беларускай культуры, звароту ў пошуках этнічнай аўтэнтыкі да ўсяго гістарычнага абшару беларускай культурнай мінуўшчыны, у першую чаргу культуры Вялікага Княства Літоўскага, таксама канца XIX – пачатку XX ст. У пэўнай ступені гэты час адпавядае распаўсюджанай у культурах свету мадэлі механізму адраджэння.

Існаванне Беларусі ў розных цывілізацыйных сістэмах адбілася на параўнальных этнічных характарыстыках гэтых беларускіх этнакультурных утварэнняў. Адным з найбольш істотных вынікаў бінарнага цывілізацыйнага ўздзеяння на беларускую этнічнасць з’яўляецца пэўная дыхатамія, нават апазіцыйнасць паслядоўных гісторыка-культурных комплексаў. Так, новая беларуская этнічная культура другой паловы XIX – пачатку XX ст. утваралася амаль без выкарыстання багатай этнакультурнай спадчыны XV–XVIII стст., якая нават разглядалася творцамі новай культуры як сацыяльна апазіцыйная, чужая. Іншым разам гэты перыяд называецца ў беларускай культуралогіі адраджэннем, аднак, зыходзячы з культурнага інструментарыю гэтай з’явы, дзе галоўнае – зварот да культуры пазапапярэдняга часу, дадзены час у беларускай этнакультурнай гісторыі адраджэннем не з’яўляецца, – гэта быў працэс стварэння новай беларускай культуры, заснаванай на традыцыйна-бытавой культуры сялянства.

У сваю чаргу, новая савецкая беларуская культура падавалася яе ідэолагамі як прынцыпова адметная не толькі ад рэалій часоў Вялікага Княства Літоўскага, але і ад нацыянал-дэмакратычнай плыні этнічнай культуры папярэдняга часу. З 90-х гг. XX ст. на хвалі ўтварэння сучаснага тыпу беларускай культуры рабіліся спробы прадукцыйнага сінтэзу ўсёй этнакультурнай спадчына беларусаў у адзіны этнічны кангламерат, аднак гэты працэс не атрымаў завяршэння.

Такая мадэль этнакультурных працэсаў уласціва і Расіі, якая прайшла перыяды старажытнарускага (Маскоўская дзяржава) часу, рэформ XVIII ст. і новай культурнай рэчаіснасці, савецкага часу і, нарэшце, сучаснай этнакультурнай сітуацыі. Таксама, ў пэўнай ступені, такі фармальны дынамічны канцэпт уласцівы балгарскаму, сербскаму, украінскаму і іншым этнасам. Разам з тым у беларускай культуры змена этнакультурных комплексаў суправаджалася пераходам яшчэ і да іншай бінарнай сістэмы дзяржаўных інстытутаў, моў, што давала дадатковы імпульс дыхатаміі этнакультурных утварэнняў.

Дадзеная асаблівасць этнакультурнай гісторыі мае як станоўчыя, так і адмоўныя вынікі. З аднаго боку, прысутнасць гістарычных этнакультурных кансорцыумаў насычае гістарычны шлях беларускай культуры, робіць яго шматвектарным, плённым для вывучэння. З іншага боку, бінарнасць гістарычных утварэнняў у пэўнай ступені дэфармуе існаванне трансчасовай устойлівай беларускай этнічнасці. Кожны новы этнакультурны кангламерат прапанаваў, навязваў сваю мадэль беларускай этнічнасці (этнагенезу і этнічнай гісторыі), і гэтыя мадэлі часта былі бінарнымі. Менавіта гэтая асаблівасць этнакультурнай гісторыі беларусаў падаецца асноўнай пры тлумачэнні праблем беларускай этнічнасці.

Досыць складана выявіць цывілізацыйны ўплыў у асяроддзі самага вялікага класа беларусаў да другой паловы XX ст. – сялянства, яго замкнёнай традыцыйнай культуры. Разам з тым цывілізацыйныя змены аб’ектыўна ўплывалі на сацыяльныя, псіхалагічныя аспекты сялянства, ствараючы адпаведны этнічны рэзананс. Так, правядзенне ў працэсе пераходу да заходняй парадыгмы валочнай рэформы, якая ліквідавала эканамічную функцыю абшчыны (грамады), заклала падмурак для фарміравання істотнага для псіхалогіі беларускага сялянства (да пачатку савецкага часу і калгасаў) індывідуалізму. Таксама змена канфесійных дамінантаў – распаўсюджванне каталіцызму, потым уніяцтва, затым пераход з уніяцтва праваслаў’е і часткова ў каталіцызм, парманентная наяўнасць у сялянскім асяроддзі розных хрысціянскіх канфесій дэфармавала апарат сістэмнай барацьбы хрысціянства з язычніцтвам, затрымлівала евангелізацыю сялянства. У выніку беларуская сялянская культура захавала вялізны слой паганства, зафіксаваны даследчыкамі другой паловы XIX – пачатку XX ст., які аб’ектыўна ствараў сістэмаўтваральны стрыжань этнаспецыфічнай культуры сялянства. Таксама і звязаная з пераходам ва ўсходнюю цывілізацыю адмена ў 1839 г. уніяцтва абвастрыла

супрацьстаянне афіцыйнага праваслаўя і іншых канфесій, у першую чаргу, каталіцызму ўнутры беларускага этнасу. Заканадаўчыя перашкоды ў Расіі праваслаўным браць шлюб с прадстаўнікамі іншых канфесій актывізавалі дыферэнцыяцыю беларусаў па рэлігійнай прыкмеце, якая існуе і ў наш час.

Такім чынам, цывілізацыйнае і этнічнае ў гісторыі беларускай культуры маюць пэўную сістэмную ўзаемасувязь: пераход да новай цывілізацыйнай супольнасці звязаны з інтэнсіфікацыяй этнічнасці, утварэннем новых спецыфічных мадыфікацый, а таксама навацый. Выключэннем з'яўляецца перыяд канца XVIII – пачатку XIX ст., калі ўваход у склад Расійскай імперыі не зрабіўся значным каталізатарам этнічнасці. Таксама спецыфікай суадносін цывілізацыйнага і этнічнага стала абвостраная апазіцыйнасць новых гістарычных этнакультурых кансорцыумаў унутры беларускай культуры.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Вуглік, І. Р.* Да праблемы перыядызацыі гісторыка-культурнага працэсу ў Беларусі / І. Р. Вуглік // Весці БДПУ. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2004. – № 4. – С. 67–71.
2. *Углик, И. Г.* Циклизм в истории культуры Беларуси / И. Г. Углик // Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества: материалы XVI Междунар. науч.-практ. конф. – Минск, 2014. – С. 91–92.
3. *Углик, И. Г.* Эволюционистская и диффузионистская парадигмы в истории культуры Беларуси / И. Г. Углик // Человек и общество в противоречиях и согласии : сб. науч. тр. по материалам Междунар. науч.-практ. конф. : в 2 ч. – Н. Новгород, 2012. – Ч. 1. – С. 141–146.
4. *Котаў, А. І.* Гісторыя Беларусі і сусветная цывілізацыя / А. І. Котаў. – 2-е выд. – Мінск : Энцыклапедыя, 1993. – 168 с.
5. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі : дапаможнік / У. А. Сосна [і інш.]; пад рэд. Л. В. Лойкі. – 2-е выд., пашыр. і папраўл. – Мінск : РІВШ, 2005, – 334 с.
6. *Вуглік, І. Р.* Беларуская культура ў сістэме каардынат Усход – Захад / І. Р. Вуглік, А. М. Кушнярэвіч // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.), І. Ф. Кітурка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2021. – С. 263–268.
7. Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў. Фрэска. Абраз, Партрэт / склад.: Н. Ф. Высоцкая, Т. А. Карповіч. – Мінск : Беларусь, 1980. – 315 с.
8. *Габрусь, Т. В.* Стылістычныя аспекты архітэктуры віленскага барока / Т. В. Габрусь // Барока ў беларускай культуры і мастацтве. – Мінск, 1998. – С. 141–157.

*Поступила в редакцию 05.04.2022*